УДК 004

В.А. Кузьміч, В.В. Шахаб
(БДТУ, г. Мінск)

# РАСПРАЦОЎКА ДЫСТАНЦЫЙНАГА КУРСА «ПРАКТЫЧНАЯ І ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ СТЫЛІСТЫКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ»

Мэта стварэння дыстанцыйнага курса па дысцыпліне “Практычная і функцыянальная стылістыка беларускай мовы” – тэхналагізацыя працэсу самастойнага авалодання студэнтамі прафесійна арыентаваным вусным і пісьмовым маўленнем у тыповых сітуацыях будучай вытворчай дзейнасці (прадстаўленне сістэмных ведаў аб стылістычным ладзе сучаснай мовы і яе стылістычных нормах, развіццё ўменняў і навыкаў стылістычнай ацэнкі моўных сродкаў і іх мэтанакіраванага выкарыстання ў залежнасці ад камунікатыўнай сітуацыі, усведамленне ролі мовы і маўлення ў працэсе сацыялізацыі і культурнай ідэнтыфікацыі асобы); удасканаленне маўленчага вопыту будучых рэдактараў-тэхнолагаў.

Паўнавартасны праект дыстанцыйнага навучання складаецца з інструктыўнага блоку, інфармацыйнага блоку (сістэмы інфармацыйнага напаўнення рэсурсу), кантрольнага блоку (механізму тэсціравання і ацэнкі), камунікатыўнага блоку (сістэмы інтэрактыўнага выкладання) і распрацаваны на модульнай аснове. Кожны модуль – гэта стандартны вучэбны комплекс, які ўключае дакладна вызначаны пералік закладзеных кампетэнцый і прызначаны для вывучэння на працягу пэўнага прамежку часу. Якасць працы фіксуецца тэставымі і заліковымі сродкамі.

Педагагічная, змястоўная арганізацыя дыстанцыйнага навучання з’яўляецца прыярытэтнай як на этапе праекціравання курса, так і ў працэсе яго выкарыстання, таму пры распрацоўцы курса забяспечана выкананне ўсіх неабходных патрабаванняў. Адлюстраваны найлепшыя дасягненні лінгвістычнай навукі, вучэбны матэрыял выкладзены зручна для карыстальніка, паслядоўна і лагічна, рэалізаваны міждысцыплінарныя і ўнутрыдысцыплінарныя сувязі, выключана дубліраванне вучэбнага матэрыялу, прадугледжана выкарыстанне сучасных метадаў навучання, рацыянальна размеркаваны вучэбны час па тэматыцы аўдыторных і самастойных заняткаў, падрыхтавана вучэбна-метадычнае забеспячэнне самастойнай работы студэнтаў. і мае сістэмны характар: вырашае задачу тэхналагізацыі працэсу бесперапыннай адукацыі, абапіраецца на сумежныя дысцыпліны, спрыяе фарміраванню агульнай прафесійнай кампетэнцыі будучых спецыялістаў, павышае моўную і маўленчую культуру спецыялістаў-выдаўцоў ва ўсіх сферах грамадскіх зносін.